Міжнародная
платформа
па прыцягненні вінаватых да адказнасці

для Беларусі

# Трэцяя справаздача аб ходзе работы дзяржавам, якія аказваюць падтрымку

Люты-верасень 2022 г.



Публічная

ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННЮ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ 3

КАРОТКІ ЗМЕСТ 4

A. Сітуацыя ў краіне 7
B. Выкананне асноўных мэтаў Міжнароднай Платформы для Беларусі 8
a. Мэты і аб’ём працы 9
b. Збор інфармацыі і доказаў 10
i. Збор інфармацыі ў пацярпелых і іншых сведак 10
ii. Збор інфармацыі з адкрытых крыніц 11
c. Кансалідацыя, захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў 11
i. Матэрыялы ад пацярпелых і сведак 11
ii. Матэрыялы з адкрытых крыніц 12
d. Дапамога органам па забеспячэнні адказнасці 12
i. Група УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 12
ii. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 13
iii. Органы крымінальнага правасуддзя 14
C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу 14
a. Сакратарыят, каманды арганізацый-сукіраўнікоў Платформы 14
b. Кансультатыўны савет 14
D. Падтрымка доступу да паслуг па ахове псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымцы 15
E. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне 15
a. Камунікацыйная палітыка 15
b. Адвакатаванне 15
F. Інфраструктура Платформы 16
a. Фінансаванне 16
b. Стандартныя аперацыйныя працэдуры 16
c. Інфармацыйныя тэхналогіі і бяспека 17
d. Кансультацыі з экспертамі 17
G. Далейшае планаванне — Фаза II і будучыня 17

Зноскі 19

## ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННІ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Платформа – гэта кааліцыя незалежных няўрадавых арганізацый, якія аб'ядналі намаганні для збору, кансалідацыі, праверкі і захавання доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, што, як мяркуецца, былі ўчынены беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. З гэтай мэтай Платформа абапіраецца на бягучую працу беларускіх праваабарончых арганізацый па зборы інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Інфармацыя і доказы, сабраныя Платформай, будуць садзейнічаць незалежным і справядлівым крымінальным расследаванням і пераследу, у адпаведнасці з міжнародным правам і стандартамі, у нацыянальных або міжнародных судах або трыбуналах, якія маюць або могуць мець юрысдыкцыю ў дачыненні да гэтых злачынстваў. Інфармацыя і доказы таксама паслужаць падтрымкай іншым механізмам, накіраваным на забеспячэнне адказнасці за злачынствы па міжнародным праве, меркавана здзейсненыя ў Беларусі, у тым ліку Групе УВКПЧ па разглядзе сітуацыі ў Беларусі.

Платформа складаецца з Кіруючага камітэта, які адказвае за кіраўніцтва працай Платформы, Сакратарыята і Кансультатыўнага савета. У склад Кіруючага камітэта ўваходзяць DIGNITY – Дацкі інстытут супраць катаванняў (старшыня Платформы), Праваабарончы цэнтр «Вясна» (сустаршыня), Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі (сустаршыня) і REDRESS (сустаршыня). Акрамя шэрагу беларускіх арганізацый, якія не пажадалі быць публічна названымі па меркаваннях бяспекі, у склад Кансультатыўнага савета ўваходзяць наступныя арганізацыі: Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR); Міжнародная федэрацыя па правах чалавека (FIDH); Міжнародны савет па рэабілітацыі ахвяр катаванняў (IRCT); Нарвежскі Хельсінкскі Камітэт; Лекары за правы чалавека (PHR); Рэпарцёры без межаў (RSF); і Сусветная Арганізацыя супраць катаванняў (OMCT). Праца Платформы вядзецца Сакратарыятам, што складаецца з юрыстаў і медыкаў, абазнаных і дасведчаных у галіне міжнародных крымінальных расследаванняў і судаводства.

Платформа была створана 24 сакавіка 2021 г. у адказ на справаздачу дакладчыка Маскоўскага механізму АБСЕ Пастаяннаму савету АБСЕ 5 лістапада 2020 г. Сярод іншага, справаздача заклікае дзяржавы прыцягнуць да адказнасці асоб, вінаватых у катаваннях і бесчалавечным абыходжанні, у тым ліку сэксуальным гвалце, і іншых грубых парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 9 жніўня 2020 года.

Платформа карыстаецца падтрымкай шырокага кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Ісландыі, Канады, Латвіі, Літвы, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцарыі і Эстоніі, а таксама Еўрапейскага Саюза.

## КАРОТКІ ЗМЕСТ

Праз два гады пасля прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года, грамадзян Беларусі параненейшаму затрымліваюць і даюць тэрміны па палітычна матываваных абвінавачваннях з боку рэжыму, які ўпарта працягвае мяняць заканадаўства з мэтай утрымаць сваю ўладу. У лютым было затрымана больш за 1100 чалавек, якія пратэставалі супраць канстытуцыйных паправак і саўдзелу Беларусі ў агрэсіі Расеі супраць Украіны, а па стане на канец верасня 2022 года ў турмах пакутуе 1324 палітвязні. Вызваленыя з-за кратаў працягваюць заяўляць пра катаванні або іншыя формы жорсткага абыходжання. Асобы, якія выязджаюць з краіны, рызыкуюць страціць пакінутую імі маёмасць і грамадзянства, а таксама сутыкнуцца з дыскрымінацыяй у іншых краінах, праз ролю Беларусі ў канфлікце ва Украіне. Многія беларусы ва Украіне, у тым ліку супрацоўнікі беларускіх членаў Платформы, былі вымушаныя бегчы ў другі раз.

Тым не менш, беларусы ўсё гэтак жа гатовыя дакументаваць выпадкі грубых парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі. Беларускія сукіраўнікі Платформы – Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі – працягваюць збіраць інфармацыю і сведчанні ў пацярпелых/сведак, якія Платформа кансалідуе, захоўвае і аналізуе разам з інфармацыяй з адкрытых крыніц для садзейнічання працэсам прыцягнення да адказнасці. За ўнёсак  у прасоўванне правоў чалавека ў Беларусі «Вясна» атрымала прэмію «Альбі» фонду Клуні за справядлівасць у катэгорыі «Справядлівасць для абаронцаў дэмакратыі», а яе заснавальнік Алесь Бяляцкі – Нобелеўскую прэмію міру.

### Збор інфармацыі і доказаў

З 1 красавіка 2021 года «Вясна» і Міжнародны камітэт сабралі інфармацыю і сведчанні ў 857 пацярпелых і іншых сведак (584 мужчын і 273 жанчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, уключаючы адпаведныя дакументальныя сведчанні, такія як медыцынскія і судовыя матэрыялы, у выніку чаго агульная колькасць дакументаў склала каля 20 000. Акрамя таго, Платформа сабрала больш аднаго мільёна матэрыялаў з адкрытых крыніц, уключаючы 82 000 відэа, 238 292 выявы і 159 030 тэкставых матэрыялаў з 213 крыніц.

### Кансалідацыя, захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў

На 30 верасня 2022 года было рэструктуравана і загружана ў лічбавы архіў Платформы каля 14 300 дакументаў, якія тычацца 2 052 пацярпелых і сведак, у тым ліку паказанні сведак, медыцынскія заключэнні і судовыя матэрыялы, а таксама адпаведныя пераклады на ангельскую мову. У адпаведнасці са стратэгіяй Платформы па працы з матэрыяламі пацярпелых/сведак, з іх было разгледжана, праверана на актуальнасць і чытэльнасць і прамаркіравана ў адпаведнасці са спецыяльна распрацаванай схемай кадавання, каля 9000 файлаў.

Акрамя таго, Платформа захавала сабраныя дадзеныя з адкрытых крыніц, уключаючы важныя метададзеныя, што забяспечыць іх даступнасць для мэтаў прыцягнення да адказнасці ў будучыні. На 30 верасня 2022 года Платформа разгледзела і маркіравала 1 800 файлаў з адкрытых крыніц у адпаведнасці са сваёй стратэгіяй па апрацоўцы матэрыялаў.

Распрацаваная Платформай сістэма кадавання, створаная з улікам беларускага кантэксту, дазваляе спецыялістам па апрацоўцы дадзеных маркіраваць кожны фрагмент інфармацыі і доказаў у адпаведнасці з пэўнымі прыкметамі. Пасля гэтага аналітыкі і юрысты Платформы змогуць правесці аналіз матэрыялаў у адпаведнасці з сістэмай кадавання на аснове прававых механізмаў, таксама распрацаванай Платформай у справаздачны перыяд, і падрыхтаваць аналітычныя матэрыялы. Таксама маецца магчымасць праводзіць пошук па дадзеных у адпаведнасці з запытамі, якія паступаюць ці будуць паступаць ад органаў па прыцягненню да адказнасці.

### Падтрымка Групы УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

Платформа аказала істотную дапамогу Групе ў перыяд з лютага па верасень 2022 года. Дапамога, прадстаўленая Платформай Групе ў снежні 2021 года, знайшла адлюстраванне ў дакладзе Вярхоўнага Камісара па правах чалавека Савету ААН па правах чалавека ў сакавіку 2022 года. У выніку некалькіх афлайн і анлайн абмеркаванняў у лютым і сакавіку 2022 года, у красавіку 2022 года Платформа і Група УВКПЧ па Беларусі заключылі другое пагадненне аб перадачы дадзеных.

Пасля працягнення мандата Групы Саветам па правах чалавека 7 красавіка 2022 года, Платформа працягвала аказваць Групе падтрымку падчас усяго пераходнага перыяду. Пасля прыходу новай каманды Групы ў ліпені 2022 года Платформа шматкроць сустракалася з яе прадстаўнікамі для абмеркавання падтрымкі расследавання з боку Платформы, у выніку чаго Групе была перададзеная інфармацыя аб 140 пацярпелых і сведках, якія жадаюць пагаварыць са следчымі Групы, і аказаная істотная лагістычная дапамога ў арганізацыі інтэрв'ю з некаторымі з іх. Па стане на 30 верасня 2022 года Платформа чакае наступныя запыты ад Групы.

### Падтрымка органаў крымінальнага правасуддзя

Платформа пашырыла існае супрацоўніцтва, наладзіўшы ўзаемадзеянне з органамі крымінальнага правасуддзя ў іншых юрысдыкцыях, такім чынам павялічыўшы колькасць еўрапейскіх дзяржаў, з якімі яна ўзаемадзейнічае наўпрост, да чатырох. У выніку гэтага ўзаемадзеяння, Платформа дае доступ да пацярпелых/сведак, аналітычных брыфаў, і іншых справаздачаў па калекцыі дадзеных.

Акрамя таго, Платформа прыняла ўдзел у шэрагу форумаў па пытаннях абмену інфармацыяй і супрацоўніцтва ў сферы крымінальнага правасуддзя, у тым ліку ў сустрэчы пракурораў і грамадзянскай супольнасці, арганізаванай Упраўленнем крымінальнага правасуддзя ЗША і Цэнтрам правасуддзя і прыцягнення да адказнасці пры Еўраюсце 8 красавіка 2022 года, і ў экспертных дыскусіях са следчымі і пракурорамі па пытаннях расследавання катаванняў і канфлікту ва Украіне.

### Кіраванне і абмен ведамі

Кіруючы камітэт Платформы і аператыўныя каманды працягвалі праводзіць штотыднёвыя нарады для прыняцця рашэнняў па пытаннях сваёй палітыкі і стратэгіі, а таксама абмяркоўваць пытанні аператыўнага характару. Былі арганізаваныя семінары і трэнінгі пры падтрымцы экспертаў Платформы, Міжнароднага інстытута крымінальных расследаванняў, міжнароднай арганізацыі «Partners in Justice International», і арганізацыі «Mnemonic».

Таксама Платформа праводзіла рэгулярныя сустрэчы з Кансультатыўным саветам. У прыватнасці, у чэрвені 2022 года быў праведзены семінар для абмеркавання вопыту, атрыманага па завяршэнні Фазы I. Для ўмацавання працы з Кансультатыўным саветам і іншымі няўрадавымі арганізацыямі ў цэлым, у рамках Фазы II Платформа будзе прытрымлівацца стратэгіі пашырэння супрацоўніцтва і каардынацыі ў дачыненні да працы, звязанай з прыцягненнем да адказнасці.

Платформа працягвала накіроўваць на атрыманне навукова абгрунтаванай дапамогі ў сферы псіхічнага здароўя і псіхасацыяльных падтрымкі (ПЗПСП) усіх пацярпелых і сведак, а таксама сваіх супрацоўнікаў. Са снежня 2021 года паслугі ПЗПСП атрымаў 71 пацярпелы (56 жанчын і 15 мужчын). У траўні і верасні 2022 года каманды Платформы прайшлі навучанне па самадапамозе і прафілактыцы выгарання, якое праводзілі эксперты па другаснай траўме.

### Камунікацыі і адвакатаванне

Пачынаючы з сакавіка, Платформа рэалізуе ўдакладненую стратэгію сувязяў з грамадскасцю, што ўключае новы рахунак на Твітары (@Iapbelaurus) і вэб-сайт (www.iapbelarus.org), для распаўсюджвання інфармацыі, у тым ліку праз паведамленні ў Твітары і прэс-рэлізы,

аб дзейнасці Платформы, калі гэта не ставіць пад пагрозу канфідэнцыяльнасць або незалежнасць працы Платформы.

### Працяг дзейнасці на этапе Фазы II і ў будучыні

У месяцы, якія папярэднічалі завяршэнню першай фазы, Платформа паспяхова правяла кансультацыі з дзяржавамі-донарамі адносна неабходнасці працягу працы на другім этапе дзейнасці. Акрамя чатырнаццаці дзяржаваў, якія пацвердзілі свае намеры ў дачыненні да другой фазы, яшчэ шэсць дзяржаваў паведамілі, што яны будуць імкнуцца даць фінансаванне ў 2023 годзе.

Прыхільнасць донараў другой фазе Платформы адлюстроўвае рэальнасць таго, што прыцягненне да адказнасці – пачынанне доўгатэрміновае. Працэс аналізу вялікіх аб'ёмаў інфармацыі і падрыхтоўкі матэрыялаў для падтрымкі органаў пракуратуры патрабуе часу, а складанасць крымінальнага расследавання і судовага пераследу буйнамаштабных міжнародных злачынстваў – падыходу, які выходзіць за рамкі кароткіх цыклаў праектнага фінансавання, па якіх звычайна працуюць донары. Органы пракуратуры могуць прыняць рашэнне аб узбуджэнні расследавання толькі праз гады пасля здзяйснення злачынстваў або тады, калі меркаваны злачынец апынецца пад іх юрысдыкцыяй. У такія моманты для эфектыўнага судовага пераследу вельмі важны свабодны доступ да інфармацыі і доказаў, што робіць дадзеныя, сабраныя Платформай, і доступ да іх у будучыні вельмі карыснымі для органаў крымінальнага правасуддзя. Для дасягнення гэтых мэтаў на працягу наступных 12 месяцаў Платформа, сярод іншага, правядзе наступныя дзеянні:

- Працягне збор, кансалідацыю, аналіз і захаванне інфармацыі і доказаў злачынстваў па міжнародным праве;
- Працягне падтрымліваць і ўмацоўваць адносіны з нацыянальнымі органамі крымінальнага правасуддзя, якія праводзяць эфектыўныя, незалежныя і бесстароннія расследаванні ў рамках універсальнай юрысдыкцыі ці іншых формаў юрысдыкцыі, і ўдзельнічаць у ініцыятывах, якія пашыраюць трансгранічнае супрацоўніцтва паміж органамі крымінальнага правасуддзя;
- Будзе падтрымліваць групу УВКПЧ па разглядзе сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі на працягу ўсяго другога тэрміну яе паўнамоцтваў, а магчыма і трэцяга, калі яе мандат будзе падоўжаны, і імкнуцца падтрымліваць іншыя органы і механізмы ААН па правах чалавека, па меры магчымасці; і
- Будзе падтрымліваць працу членаў Кіруючага камітэта і Кансультатыўнага савета Платформы, звязаную з прыцягненнем да адказнасці.

Донарская падтрымка таксама адлюстроўвае прызнанне каштоўнасці Платформы як мадэлі ў іншых кантэкстах, а таксама верагоднасць далейшага прымянення значнай часткі работы па стварэнні яе інфраструктуры ў іншых краінах. Адпаведна, акрамя забеспячэння доўгатэрміновасці вынікаў працы Платформы, адной з яе задач на другім этапе з'яўляецца вывучэнне магчымасці прымянення распрацаванай ёю інфраструктуры і інструментаў у іншых кантэкстах і ў Беларусі пасля завяршэння другой фазы Платформы. Стандартныя аперацыйныя працэдуры, кіраўніцтвы і лічбавая інфраструктура з мінімальнымі карэкціроўкамі могуць быць перанесены ў іншыя кантэксты, а падрыхтаваная каманда зможа ўкараняць іх у партнёрстве з мясцовымі экспертамі, і падтрымліваць працу па зборы, захаванню, верыфікацыі і аналізу інфармацыі і доказаў злачынстваў, учыненых у іншых краінах, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі перадавой практыкі. Больш за тое, Платформа ўжо падзялілася сваім досведам і інструментамі з іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і праектамі па прыцягненні да адказнасці, якія працуюць у кантэксце Украіны і атрымліваюць падтрымку Міністэрства замежных спраў Даніі.

## A. Сітуацыя ў краіне

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі працягвае пагаршацца. Па-ранейшаму рэгулярна здараюцца масавыя выпадкі палітычна матываваных затрыманняў і крымінальнага пераследу грамадзян, а вызваленыя з-пад варты працягваюць заяўляць пра катаванні ды іншыя формы жорсткага абыходжання. Прыняцце паправак у Крымінальны і Адміністрацыйны кодэксы, заканадаўства, якое рэгулюе адвакатуру, а таксама правядзенне канстытуцыйнага рэферэндуму ў лютым, падобна, накіраваныя на ўмацаванне ўлады рэжыму Лукашэнкі. Нешматлікія незалежныя некамерцыйныя арганізацыі, у тым ліку грамадскія аб'яднанні, прафсаюзы, фонды, недзяржаўныя ўстановы і асацыяцыі, па-ранейшаму падвяргаюцца ліквідацыі, а Telegram - і YouTube-каналы і іншыя крыніцы інфармацыі прызнаюцца «экстрэмісцкімі». Беларускія ўлады не прыцягнулі да адказнасці нікога з вінаватых у грубых парушэннях правоў чалавека ў Беларусі.

Пасля пачатку расійскай агрэсіі супраць Украіны 24 лютага 2022 года тысячы беларусаў выйшлі на вуліцы ў знак пратэсту супраць падтрымкі Расіі Беларуссю, а некаторыя грамадзяне распачалі актыўныя спробы прадухіліць перамяшчэнне ваеннай тэхнікі і зброі па беларускай тэрыторыі. Па наяўных звестках, беларускія ўлады ўжылі празмерную сілу супраць мірных дэманстрантаў на антываенных мітынгах і выкарыстоўвалі баявую зброю супраць актывістаў, якія спрабавалі заблакаваць перамяшчэнне ўзбраенняў па чыгуначных шляхах.[1] 27 лютага 2022 года, у дзень правядзення рэферэндуму па папраўках у Канстытуцыю, беларускія ўлады затрымалі сотні грамадзян па ўсёй краіне. Да канца лютага 2022 года было затрымана больш за 1100 чалавек. Вызваленыя з тых пор з-пад варты сцвярджаюць, што іх катавалі і падвяргалі іншым формам жорсткага абыходжання. Па-за кантэкстам пратэсных акцый беларускія ўлады працягваюць праводзіць ператрусы ў дамах і на працоўных месцах, дапытваць і затрымліваць грамадзян.

З лютага 2022 года колькасць палітычных зняволеных, пра якія вядома праваабаронцам, павялічылася да 1324 чалавек,[2] у параўнанні з 1022, аб якіх паведамлялася ў студзені.[3] Сем сябраў "Вясны", у тым ліку лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру, яе старшыня Алесь Бяляцкі і сябра праўлення Валянцін Стэфановіч, па-ранейшаму ўтрымліваюцца пад вартай.[4] У чэрвені 2022 года сябра "Вясны" і кіраўнік Цэнтра стратэгічных цяжбаў Леанід Судаленка быў асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі, а валанцёрка "Вясны" Таццяна Ласіца – да двух гадоў і шасці месяцаў зняволення.[5] У верасні 2022 года абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў супраць яе старшыні Алеся Бяляцкага і сябра праўлення Валянціна Стэфановіча былі перакваліфікаваныя на кантрабанду грашовых сродкаў і фінансаванне групавых дзеянняў, якія парушаюць грамадскі парадак, што прадугледжвае ўзмацненне жорсткасці санкцый у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 7 да 12 гадоў.[6] У знак прызнання працы "Вясны" 30 верасня 2022 года Фонд Клуні за справядлівасць уганараваў іх прэміяй "Альбі" ў катэгорыі "Правасуддзе для абаронцаў дэмакратыі".

Беларускія ўлады заканадаўча ўзмацнілі адказнасць па абвінавачваннях, звязаных з тэрарызмам. 27 красавіка 2022 года ў выніку паспешнага ўнясення паправак у артыкулы 59 і 67 Крымінальнага кодэкса было ўведзена смяротнае пакаранне за спробу здзяйснення тэрарыстычнага акту – у чым абвінавачваліся некаторыя палітычныя зняволеныя.[7] Мяркуючы па нядаўніх прысудах,[8] папраўкі, падобна, накіраваныя супраць грамадзян, якія імкнуцца выказаць свае палітычныя погляды.

Да 1 ліпеня 2022 года, паводле звестак Следчага камітэта Беларусі, пасля жнівеньскіх выбараў улады распачалі 11 000 крымінальных спраў «экстрэмісцкага характару».[9] Улады сістэматычна ўжываюць артыкул 19.11 КаАП –распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў» – для барацьбы з незалежнай журналістыкай і працягваюць папаўняць спіс «экстрэмісцкіх» рэсурсаў, такіх як мясцовыя Telegram-каналы, групы ў сацыяльных сетках і YouTube-каналы. Да канца верасня Міністэрства ўнутраных спраў і Камітэт дзяржаўнай бяспекі ўключылі ў спіс «экстрэмістаў» 2400 арганізацый (у тым ліку «Малады фронт» і «Хартыю-97») і 573 грамадзян.[10]

Доступ да паслуг адваката па-ранейшаму ўскладнены. На момант напісання справаздачы 11 адвакатаў былі затрыманыя па цэлым шэрагу меркавана палітычна матываваных абвінавачванняў,[11] а 70 адвакатаў – пазбаўленыя права на практыку. Колькасць адвакатаў павольна скарачалася на працягу апошняга года – з 2031 у кастрычніку 2021 года да 1742 у ліпені 2022 года)[12] – пасля ўнясення паправак у заканадаўства, якія дазваляюць Міністэрству юстыцыі наўпрост умешвацца ў прызначэнне і накладанне дысцыплінарнай адказнасці на адвакатаў.

У спробе прымусіць замаўчаць грамадзянскую супольнасць у Беларусі, беларускія ўлады працягвалі ліквідаваць некамерцыйныя арганізацыі, у тым ліку грамадскія аб’яднанні, прафсаюзы, фонды і недзяржаўныя ўстановы. Пасля выбараў у жніўні 2020 года было ліквідавана або знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі 646 некамерцыйных арганізацый, яшчэ 374 арганізацыі прынялі рашэнне аб самаліквідацыі.[13]

17 жніўня 2022 года Савет Міністраў Беларусі скасаваў адну з апошніх магчымасцяў атрымання прававой абароны на ўзроўні ААН, ініцыяваўшы прынясце закона аб выхадзе з першага Факультатыўнага пратакола Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП), які быў прыняты Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі, і падпісаны Лукашэнкам.[14] Закон пазбаўляе асоб, пацярпелых ад парушэнняў правоў чалавека, акрэсленых у МПГПП, магчымасці звярнуцца ў Камітэт ААН па правах чалавека.

Пасля пачатку канфлікту ва Украіне агульная сітуацыя для беларусаў у Беларусі і за яе межамі пагоршылася. Многія беларусы, якія пражывалі ва Украіне, у тым ліку члены каманд арганізацый Платформы, былі вымушаныя бегчы ў другі раз. Яны і іншыя беларусы сутыкаюцца з дыскрымінацыяй у іншых краінах, з прычыны супрацоўніцтва Беларусі з Расеяй і яе меркаванай ролі ў канфлікце. Праз санкцыі супраць Беларусі былі заблакаваныя рахункі і транзакцыі беларускіх банкаў, што сур’ёзна паўплывала на пакупніцкую здольнасць грамадзян. Уварванне ва Украіну і наступны узброены канфлікт – гэта самы цяжкі крызіс у галіне правоў чалавека ў Еўропе за апошнія дзесяцігоддзі, што нясе сур’ёзныя пагрозы бяспекі для Беларусі і рэгіёну. З улікам маштабаў абуральных злачынстваў ва Украіне, жорсткія рэпрэсіі ў Беларусі рызыкуюць стаць «забытым» крызісам у галіне правоў чалавека, дзе рэжым Лукашэнкі можа пазбегнуць адказнасці.

## B. Выкананне асноўных мэтаў Міжнароднай Платформы для Беларусі

Пасля стварэння інфраструктуры і рабочых працэдур па зборы і захаванні інфармацыі і доказаў, пра якія гаварылася ў папярэдняй справаздачы ў лютым 2022 года, Платформа значна прасунулася ў галіне аналізу сабранай інфармацыі і доказаў, заклаўшы аснову для падрыхтоўкі аналітычных брыфаў для органаў крымінальнага правасуддзя, а таксама працягнула аказваць падтрымку групе УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі ў Беларусі.

На першым этапе (з красавіка 2021 года па чэрвень 2022 года) Платформа выканала свае асноўныя задачы па зборы, кансалідацыі і захаванні інфармацыі і доказаў злачынстваў па міжнародным праве, меркавана здзейсненых у Беларусі, з мэтай садзейнічання справядліваму і незалежнаму крымінальнаму правасуддзю і іншым органам і працэсам прыцягнення да адказнасці. На другім этапе (з ліпеня 2022 года па верасень 2023 года), працягваючы працу па падтрымцы органаў крымінальнага правасуддзя, Платформа па-ранейшаму захоўвае інфармацыю і доказы, сабраныя беларускімі арганізацыямі, якія з'яўляюцца сукіраўнікамі Платформы, і з іншых крыніц (у тым ліку дадзеныя з адкрытых крыніц), апрацавала больш за 50% сабранай інфармацыі і доказаў, пачала падрыхтоўку аналітычных прадуктаў для органаў па прыцягненні да адказнасці, пашырыла ўзаемадзеянне з органамі крымінальнага правасуддзя і аказала падтрымку групе УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі ў Беларусі. Для садзеяння гэтай працы Платформа таксама правяла мерапрыемствы па абмене ведамі і нарошчванню патэнцыялу і падтрымала доступ да ПЗПСП і інструментам для зніжэння другаснай траўматызацыі і стрэсу.

У месяцы, якія папярэднічалі завяршэнню першай фазы, Платформа правяла кансультацыі з дзяржавамі-донарамі адносна неабходнасці працягу працы на другім этапе дзейнасці. Пасля таго, як дзяржавы пацвердзілі сваю згоду фінансаваць Фазу II, Платформа перагледзела мерапрыемствы, якія планавалася ажыццявіць да канца Фазы I, з улікам больш доўгага перыяду працы. Адпаведна, былі ўнесены карэктывы ў працу па праверцы і аналізе сабранай інфармацыі і доказаў, а таксама па падрыхтоўцы аналітычных прадуктаў, каб больш эфектыўна садзейнічаць органам па прыцягненні да адказнасці. Ніжэй пададзена больш падрабязнае апісанне гэтых зменаў.

### a. Мэты і аб'ём працы

Як паказана ў папярэдняй паўгадавой справаздачы, мэта Платформы – кансалідацыя і захаванне інфармацыі і доказаў для падтрымкі расследаванняў і аналізу фактычнай і прававой інфармацыі па трох асноўных напрамках, звязаных з меркаваным здзяйсненнем злачынстваў у Беларусі:

a. **Факты злачынстваў**, а менавіта ўчынкі, што ляжаць у аснове злачынстваў супраць чалавечнасці, такія як пераслед, катаванні, сэксуальны і гендэрны гвалт, дэпартацыя, турэмнае зняволенне і забойствы/пазасудовыя забойствы;
b. **Кантэкстуальныя элементы злачынстваў супраць чалавечнасці**, а менавіта наяўнасць шырокамаштабнага або сістэматычнага нападу, накіраванага супраць грамадзянскага насельніцтва, у адпаведнасці з палітыкай беларускай дзяржавы або ў яе развіццё; і
c. **Датычнасць** выканаўцаў да асноўных злачынных дзеяў, у тым ліку фізічных выканаўцаў, а таксама тых, хто нясе іншую адказнасць у сілу сваёй пасады ў камандных структурах.

Пры першапачатковым фінансаванні, разлічаным да 30 чэрвеня 2022 года, Платформа планавала апрацаваць сабраныя матэрыялы і падрыхтаваць вузкія аналітычныя прадукты для органаў прыцягнення да адказнасці на аснове іх запытаў. Акрамя прадастаўлення доступу да пацярпелых/сведак і матэрыялаў у сховішчы доказаў Платформы, у дадзены план ўваходзіла падрыхтоўка аналітычных

справаздач. Як апісана ніжэй (раздзел B. c. i), першапачатковыя прагнозы таго, што нават гэты больш абмежаваны аб’ём працы можа быць выкананы да канца Фазы I, апынуліся занадта аптымістычнымі, што прывяло да неабходнасці вызначэння больш вузкіх падыходаў да аналізу дадзеных і падтрымкі органаў правасуддзя.

У сувязі з атрыманнем фінансавання на другі этап працы, Платформа перагледзела гэтыя падыходы і скарэктавала свае працоўныя метады, прыняўшы больш комплексны і, такім чынам, больш эфектыўны падыход, а таксама пашырыўшы сферу прымянення сваіх прадуктаў і інструментаў.

## b. Збор інфармацыі і доказаў

Платформа працягнула збор інфармацыі і доказаў у пацярпелых і сведкаў, а таксама з адкрытых крыніц, якія могуць служыць доказам злачынстваў па міжнародным праве, здзейсьненых беларускімі ўладамі.

Адной з асноўных складанасцяў пры зборы інфармацыі і доказаў няўрадавымі арганізацыямі з’яўляецца адсутнасць прававога статусу, на падставе якога можна было б патрабаваць прадастаўлення інфармацыі і доказаў, а таксама адсутнасць магчымасці забеспячэння таго, каб любое ўзаемадзеянне з пацярпелымі, сведкамі і іншымі патэнцыяльнымі крыніцамі не аказала негатыўнага ўплыву на будучыя крымінальныя працэсы. Напрыклад, паўторнае апытанне аднаго пацярпелага або сведкі некалькімі суб’ектамі можа паўплываць на яго ўспаміны і/або стварыць некалькі варыянтаў апісання яго гісторыі, дакладнасць якіх затым можа быць аспрэчана абвінавачаным на судзе. У тых выпадках, калі органы крымінальнага правасуддзя, верагодна, будуць апытваць пацярпелых/сведак або выклікаць іх сведчыць у суд, найлепшыя практыкі рэкамендуюць няўрадавым арганізацыям задумацца пра тое, ці варта ім апытваць гэтых людзей у дадзеных абставінах, з улікам іншых варыянтаў і магчымасцяў прыцягнення вінаватых да адказнасці. Гэтак жа, апытанне патэнцыйных сведак-інсайдэраў (г.зн. (былых) супрацоўнікаў сілавых структур), якія самі могуць быць датычныя да здзяйснення злачынстваў, як правіла, выклікае асцярожнае стаўленне з боку органаў крымінальнага правасуддзя, якія абавязаны папярэдзіць такіх асоб пра іх правы, у тым ліку права захоўваць маўчанне, у адпаведнасці з нацыянальнай або міжнароднай крымінальнай працэдурай. Адпаведна, няўрадавыя суб’екты павінны ставіцца да любых кантактаў з інсайдэрамі з мэтай збору інфармацыі з асаблівай асцярожнасцю. Платформа ўлічвае ўсе гэтыя фактары пры вызначэнні неабходнасці паўторнага апытання пацярпелых/сведак, а таксама пры разглядзе пытання аб звароце да іншых крыніц інфармацыі і доказаў.

### i. Збор інфармацыі ў пацярпелых і іншых сведак

З 1 красавіка 2021 года «Вясна» і Міжнародны камітэт сабралі інфармацыю і сведчанні ў 857 пацярпелых і іншых сведак (584 мужчын і 273 жанчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, у тым ліку адпаведныя дакументальныя сведчанні, такія як медыцынскія і судовыя матэрыялы, у выніку чаго агульная колькасць дакументаў склала каля 20 000. Гэтыя дакументы апрацоўваюцца для захавання і аналізу (падрабязней гл. B. c. i), пры гэтым асобныя інтэрв’ю са сведкамі і дакументальныя матэрыялы перакладзеныя з рускай/беларускай на ангельскую мову і захаваныя разам з матэрыяламі на мове арыгіналу.

### ii. Збор інфармацыі з адкрытых крыніц

Паралельна са зборам і захоўваннем матэрыялаў, звязаных з пацярпелымі/сведкамі, на працягу ўсяго справаздачнага перыяду Платформа працягвала збіраць дадзеныя з адкрытых крыніц. З красавіка 2021 года было сабрана больш за 600 000 матэрыялаў з адкрытых крыніц, у тым ліку 82 000 відэа, 238 292 выявы і 159 030 тэкставыя матэрыялы з 213 крыніц, якія захоўваюцца і аналізуюцца (гл. раздзел B.c. ii ніжэй).

## c. Кансалідацыя, захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў

Для захавання сабранай інфармацыі і сведчанняў, праверкі іх сапраўднасці (пры неабходнасці) і іх аналіза Платформа выкарыстоўвае два спецыяльна распрацаваныя лічбавыя архівы. З лютага па верасень 2022 года Платформа правяла тэставанне і дапрацавала аперацыйныя працэдуры, звязаныя з выкарыстаннем архіваў, загрузіла большую частку сабранай на сённяшні дзень інфармацыі і доказаў, у тым ліку дадзеныя з адкрытых крыніц, і прааналізавала значны аб’ём матэрыялаў.

### i. Матэрыялы ад пацярпелых і сведак

Структура для загрузкі матэрыялаў была распрацавана Сакратарыятам Платформы ў лістападзе-снежні 2021 года. У студзені 2022 года пачаўся працэс рэструктурызацыі і загрузкі інфармацыі і доказаў, сабраных Платформай, у лічбавыя архівы. На 30 верасня 2022 года было рэструктуравана і загружана каля 14 300 дакументаў,[15] якія тычацца 2052 пацярпелых і сведак, у тым ліку паказанні сведак, медыцынскія заключэнні і судовыя матэрыялы, а таксама адпаведныя пераклады на англельскую мову.

У лютым і сакавіку 2022 года была распрацавана першапачатковая падрабязная стратэгія апрацоўкі файлаў з матэрыяламі пацярпелых/сведак, якая ўдакладнялася ў наступныя месяцы з улікам досведу, назапашанага ў ходзе яе прымянення. Згодна з гэтай стратэгіяй, файлы правяраюцца на рэлевантнасць і чытэльнасць, затым праглядаюцца і маркіруюцца ў адпаведнасці з сістэмай кадавання, распрацаванай Платформай. Далей праводзіцца кантроль якасці, пасля чаго адабраныя дадзеныя праходзяць далейшы аналіз для падрыхтоўкі аналітычных брыфаў і справаздач.

На 30 верасня 2022 года апрацавана і маркіравана 9000 файлаў (45% ад агульнай колькасці).

Платформа будзе рыхтаваць справаздачы па асобных тэмах, каб дапамагчы органам па забеспячэнні адказнасці зарыентавацца ў наяўных дадзеных. Такім чынам, база дадзеных не толькі падтрымлівае фактычны і прававы аналіз і падрыхтоўку сведчанняў і аналітычных справаздач, але і дазваляе фармуляваць запыты на дапамогу і доступ да інфармацыі і сведчанняў з боку розных органаў, у адпаведнасці з выяўленымі патрэбамі, як у кароткай, так і ў доўгатэрміновай перспектыве.

Адна з асноўных цяжкасцяў, з якімі сутыкаецца Платформа, – гэта працягласць працэсу апрацоўкі, маркіроўкі і аналізу дадзеных. Першапачатковыя прагнозы таго, што такая праца можа быць завершана да чэрвеня 2022 года, апынуліся цяжкадасягальнымі з-за шэрагу фактараў, у там ліку: (i) час, які спатрэбіўся для стварэння каманды Платформы ў 2021 годзе, а таксама ўнутраных працэдур і структур, неабходных для адпаведнасці міжнародным стандартам крымінальнага правасуддзя; (ii) абмежаванні ўбудаваных функцый транскрыбавання і перакладу,

што запатрабавала знаходжання і ўвасаблення альтэрнатыўнага рашэння, якое адпавядае строгім патрабаванням бяспекі, згодна якіх працуе Платформа; і (iii) значныя чалавечыя рэсурсы, неабходныя для вывучэння доўгіх паказанняў сведак і спадарожных матэрыялаў, якія ўтрымліваюць траўматычны кантэнт, што патрабуе стварэння сістэм для мінімізацыі другаснай траўматызацыі, у тым ліку рэгулярных перапынкаў і дыверсіфікацыі задач. Як толькі дзяржавы паабяцалі фінансаванне Фазы II, Платформа знайшла дадатковыя чалавечыя рэсурсы, неабходныя для выканання гэтай працы.

#### ii. Матэрыялы з адкрытых крыніц

Захаванне арыгінальных дадзеных з адкрытых крыніц у адпаведным лічбавым архіве Платформы забяспечвае іх даступнасць для органаў па прыцягненні да адказнасці і іншых асоб у далейшыя гады. Гэты інструмент мінімізуе верагоднасць страты доступу да інфармацыі з адкрытых крыніц, якая змяшчае доказы злачынстваў, здзейсненых у Беларусі, пры ўвядзенні беларускімі ўладамі абмежаванняў на доступ да незалежных СМІ (напрыклад, шляхам адклікання рэдакцыйных ліцэнзій) або пры выдаленні дадзеных хостынгавымі сайтамі або асобамі, якія іх апублікавалі. Так, інфармацыя з адкрытых крыніц, сабраная Платформай, была выдаленая з зыходных хостынгавых сайтаў; такія матэрыялы былі б назаўжды страчаныя, калі б Платформа іх не архівавала. Архіў таксама падтрымлівае захаванне матэрыялаў у такой форме, якая забяспечыць іх прыдатнасць для выкарыстання органамі па забеспячэнні адказнасці ў наступныя гады, захоўваючы копію арыгінальнага матэрыялу з адкрытых крыніц разам з такімі метададзенымі, як дата і час архівавання і URL.

Улічваючы аб’ём матэрыялаў з адкрытых крыніц (больш за 600 000 файлаў), Платформа не можа вывучыць і маркіраваць ўсе з іх. Замест гэтага, згодна з мэтамі расследавання і аналізу, Платформа выкарыстоўвае розныя пошукавыя тэрміны і метады пошуку для выяўлення адпаведных матэрыялаў, якія затым арганізуюцца ў тэматычныя групы для хуткай навігацыі (гл. раздзелы B. a. і C. d). Далей гэты матэрыял вывучаецца і маркіруецца ў адпаведнасці са структурай кадавання, прынятай у Платформе.

Па стане на 30 верасня 2022 года мы вывучылі і прамаркіравалі 1800 файлаў з адкрытых крыніц, у тым ліку відэазапісы пратэстаў, затрыманняў і іншых інцыдэнтаў.

### d. Дапамога органам па забеспячэнні адказнасці

Платформа працягвала ўзаемадзейнічаць і падтрымліваць органы па прыцягненні да адказнасці, у тым ліку з групай УВКПЧ па разглядзе сітуацыі ў Беларусі, Спецыяльным дакладчыкам па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і шматлікімі нацыянальнымі органамі крымінальнага правасуддзя.

#### i. Група УВКПЧ па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

Платформа імкнецца аказваць падтрымку групе УВКПЧ у рэалізацыі яе мандата па правядзенні ўсебаковага вывучэння ўсіх меркаваных парушэнняў правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Дапамога, прадстаўленая Платформай Групе УВКПЧ у снежні 2021 года,[16] знайшла адлюстраванне ў дакладзе Вярхоўнага Камісара па правах чалавека Савета ААН па правах чалавека ў сакавіку 2022

года.[17] Мы па-ранейшаму аказваем падтрымку новаму складу групы УВКПЧ пасля падаўжэння яе мандата Саветам па правах чалавека 7 красавіка 2022 года.[18]

Да заканчэння мандата першай групы УВКПЧ у сакавіку 2022 года каманды Платформы і УВКПЧ неаднаразова сустракаліся для абмеркавання тэм, якія тычацца сферы іх працы.

У выніку гэтых дыскусій, у сакавіку 2022 года Платформа і група УВКПЧ падпісалі другое пагадненне аб перадачы дадзеных (першае было заключана ў снежні 2021 года).

Пасля працягнення мандата Групы, Платформа правяла вялікую колькасць сустрэч з пераходнай камандай да чэрвеня 2022 года і з новай камандай, якая прыступіла да працы ў ліпені 2022 года. Платформа неаднаразова сустракалася з Групай, каб абмеркаваць далейшую падтрымку. Па выніках гэтых сустрэч у жніўні і верасні Платформа падзялілася інфармацыяй аб 140 пацярпелых і іншых патэнцыйных сведках і аказала значную лагістычную дапамогу следчым Групы ў правядзенні значнай колькасці інтэрв'ю. Чальцы каманд беларускіх арганізацый Платформы таксама былі апытаныя адносна агульнага кантэксту, у якім былі здзейснены парушэнні, а таксама Платформа падала Групе інфармацыю па больш агульных пытаннях, звязаных з прыцягненнем да адказнасці.

Пры стварэнні Платформы меркавалася, што яна будзе займацца зборам і захаваннем інфармацыі і патэнцыйных доказаў і прадастаўляць іх разам з аналітычнымі справаздачамі Групе УВКПЧ для выкарыстання ў расследаванні, калі такая будзе створана. Аднак у гэтую першапачатковую канцэпцыю давялося ўнесці карэктывы. Каманды Платформы і Групы УВКПЧ працавалі паралельна, такім чынам, што праца Платформы па структураванні, апрацоўцы і аналізе дадзеных вялася паралельна з расследаваннямі, якія праводзяцца УВКПЧ. Акрамя таго, ужо на раннім этапе стала відавочна, што некаторыя пацярпелыя і іншыя патэнцыйныя сведкі не далі згоды на прадастаўленне сваіх матэрыялаў Групе УВКПЧ, а інфармаваная згода іншых сведак патрабавала абнаўлення, з улікам прамінулага перыяду часу і значнага пагаршэння сітуацыі для тых, хто застаецца ў Беларусі.

Стандарты УВКПЧ па дакументаванні правоў чалавека таксама патрабуюць ад Групы правядзення ўласных інтэрв'ю. Нягледзячы на некаторыя асцярогі наконт дублявання працы і магчымасці паўторнай траўматызацыі пацярпелых і сведак, з досведу Платформы, пацярпелыя і сведкі, якіх яна дапамагла прыцягнуць да супрацоўніцтва з Групай, самі хочуць яшчэ раз распавесці сваю гісторыю і тым самым зрабіць свой унёсак у апублікаваны даклад аб грубых парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Каб звесці да мінімуму паўторную траўматызацыю пацярпелых і сведак, Платформа забяспечыла ім магчымасць прысутнасці клінічных псіхолагаў падчас і/або пасля інтэрв'ю (гл.таксама раздзел D аб прадастаўленні ПЗПСП).

### ii. Спецыяльны дакладчык па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

На працягу справаздачнага перыяду Платформа сустрэлася са Спецыяльным дакладчыкам па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, каб абмеркаваць яе працу і магчымую падтрымку Патформай яе прыярытэтаў у будучыні. Мы працягваем дыялог са Спецыяльным дакладчыкам з мэтай вызначэння патэнцыйных сфер аказання падтрымкі.

### iii. Органы крымінальнага правасуддзя

У адпаведнасці са сваімі мэтамі, названымі ў апошняй справаздачы аб ходзе працы, Платформа пашырыла існае супрацоўніцтва, наладзіўшы ўзаемадзеянне з органамі крымінальнага пераследу ў іншых юрысдыкцыях. Гэтыя кантакты ажыццяўляліся з дапамогай двухбаковых сустрэч, абмену пісьмовымі паведамленнямі і ўдзелу ў шматбаковых мерапрыемствах. Да такіх мерапрыемстваў адносіцца сустрэча ў Еўраюсце 8 красавіка 2022 года, арганізаваная Упраўленнем ЗША па пытаннях глабальнага крымінальнага правасуддзя і Цэнтрам правасуддзя і забеспячэння адказнасці, у якой прынялі ўдзел органы крымінальнага правасуддзя з шэрагу дзяржаў, а таксама беларускія і міжнародныя грамадскія арганізацыі. У выніку гэтых кантактаў Платформа атрымала запыты на доступ да інфармацыі і доказаў і на аналітычныя брыфы ад органаў крымінальнага правасуддзя шэрагу еўрапейскіх дзяржаў і працуе над падрыхтоўкай гэтых матэрыялаў.

Адна са складанасцяў пры падрыхтоўцы аналітычных брыфаў звязаная з роляй Платформы ў кантэксце крымінальных расследаванняў і судовага пераследу. Як адзначалася вышэй, Платформа не мае прававых паўнамоцтваў, што абмяжоўвае яе магчымасці па прымусе да прадстаўлення доказаў і патрабуе ўлічваць уплыў дзеянняў па зборы інфармацыі і доказаў на крымінальныя працэсы ў будучыні. Акрамя таго, хоць Платформа і знаходзіць апраўдальныя доказы, яна не абавязаная іх збіраць. Гэтыя фактары азначаюць, што доступ да пэўных матэрыялаў можа быць абмежаваны, па факце або наўмысна. Таму Платформа павінна празрыста пазначаць гэтыя абмежаванні і прыняць іх пад увагу з пункту гледжання стандарту доказаў, на які абапіраецца любы аналіз, падрыхтаваны для органаў крымінальнага правасуддзя.

## C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу

### a. Сакратарыят, каманды арганізацый-сукіраўнікоў Платформы

Структура Платформы забяспечвае цеснае супрацоўніцтва паміж камандамі арганізацыі-кіраўніка, арганізацый-сукіраўнікоў і Сакратарыята. У перыяд з лютага па верасень 2022 года Кіруючы камітэт праводзіў штотыднёвыя і спецыяльныя пасяджэнні для прыняцця рашэнняў адносна палітыкі і стратэгіі працы Платформы, а таксама сумесна ўдзельнічаў у мерапрыемствах і сустрэчах зацікаўленых бакоў, як адкрытых, так і канфідэнцыйных. Сакратарыят працягваў працаваць у цесным супрацоўніцтве з групамі па дакументаванні арганізацый-сукіраўнікоў, у тым ліку з дапамогай штотыднёвых нарад па аператыўных пытаннях і рэгулярных офлайн семінараў.

У рамках гэтага ўзаемадзеяння Платформа праводзіць спецыяльныя семінары і трэнінгі па актуальных тэмах, якія робяцца пры падтрымцы экспертаў-кансультантаў Платформы (пра іх гаворыцца ў раздзеле F. e ніжэй).

### b. Кансультатыўны савет

Кансультатыўны савет збіраўся на працягу 2022 года для абмену інфармацыяй пра працу членаў КС, садзейнічання каардынацыі і супрацоўніцтву, а таксама абмеркавання вынесеных урокаў. Члены Кансультатыўнага савета часта сумесна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах, у тым ліку ў тых, што пералічаны ў раздзеле E.b ніжэй. У бліжэйшыя месяцы Платформа будзе рэалізоўваць стратэгію больш

актыўнага ўзаемадзеяння з Кансультатыўным саветам з мэтай умацавання супрацоўніцтва і каардынацыі працы, звязанай з прыцягненнем да адказнасці.

## D. Падтрымка доступу да паслуг па ахове псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымцы

У рамках свайго арыентаванага на пацярпелых і траўма-свядомага падыходу да прыцягнення да адказнасці за злачынствы па міжнародным праве, здзейсненыя ў Беларусі, Платформа імкнецца да забеспячэння пацярпелым навукова абгрунтаванай дапамогі ў галіне псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі (ПЗПСП). Мы працягваем ажыццяўляць схемы накіравання на ПЗПСП і адзіную сістэму клінічнага маніторынгу і ацэнкі, куды ўваходзіць збор інфармацыі аб стрэсе, дэпрэсіі, сне і самаадчуванні. Са снежня 2021 года паслугі ПЗПСП атрымаў 71 пацярпелы (56 жанчын і 15 мужчын).

Акрамя таго, Платформа забяспечвае доступ сваіх каманд да ПЗПСП і надае прыярытэтную ўвагу ўдасканаленню патэнцыялу ўсіх задзейнічаных каманд па кіраванні другаснай траўмай і стрэсам. У траўні і верасні 2022 года каманды Платформы прайшлі навучанне ў экспертаў па другаснай траўме у пытаннях самадапамогі і прафілактыкі выгарання. Для ўсіх каманд Платформы былі створаны і выкарыстоўваюцца механізмы перанакіравання для доступу да ПЗПСП.

## E. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне

### a. Камунікацыйная палітыка

Платформа прытрымліваецца асцярожнай палітыкі ў дачыненні да публічнай камунікацыі пра сваю дзейнасць і яе вынікі для абароны бяспекі людзей, задзейнічаных у працы і тых, хто прадстаўляе інфармацыю, а таксама для захавання нейтралітэту і незалежнасці Платформы. Першапачаткова Платформа адхіляла большасць запытаў СМІ на інтэрв›ю і згаджалася на інтэрв›ю толькі ў пісьмовым выглядзе.[19]

У той жа час важна забяспечыць празрыстасць працы Платформы, каб пацярпелыя і беларуская грамадскасць у цэлым былі ў курсе працы Платформы і маглі зрабіць свой унёсак у яе дзейнасць. Таму, пачынаючы з сакавіка 2022 года, Платформа рэалізуе абноўленую стратэгію па сувязях з грамадскасцю. У сакавіку і красавіку, адпаведна, былі створаны новы рахунак на Твітары (@Iapbelarus) і вэбсайт (www.iapbelarus.org), якія выкарыстоўваюцца для распаўсюджвання інфармацыі, у тым ліку праз пасты ў Твітары і прэс-рэлізы, аб дзейнасці Платформы, пры ўмове, што гэта не ставіць пад пагрозу канфідэнцыяльнасць або незалежнасць працы Платформы.[20]

### b. Адвакатаванне

Аналагічна, Платформа прытрымліваецца асцярожнай палітыкі ў сферы адвакатавання, каб захаваць незалежнасць і бесстароннасць, а таксама рэпутацыю незалежнасці і бесстароннасці, у сваёй следчай і кансультацыйнай працы. Тым не менш, на палітычным узроўні Платформа рэгулярна ўдзельнічала ў двухбаковых абмеркаваннях з палітыкамі і іншымі ключавымі гульцамі, а часам і выступала на грамадскіх форумах. Сярод выступаў можна адзначыць наступныя:

- Выступы кіраўніка Платформы і прадстаўніка Міжнароднага камітэта на паралельным мерапрыемстве ў рамках 49-й сесіі СПЧ у Жэневе на тэму *«Наступныя крокі да прыцягнення да адказнасці ў Савеце па правах чалавека»* (23 лютага 2021).
- Выступ на дадатковай нарадзе АБСЕ па чалавечым вымярэнні ў Варшаве, прысвечанай міжнароднаму супрацоўніцтву ў барацьбе з парушэннямі міжнароднага гуманітарнага права і міжнароднага права правоў чалавека (28-29 сакавіка 2022 года).
- Выступы кіраўніка Платформы і прадстаўніка Беларусі на канферэнцыі АБСЕ па *барацьбе з беспакаранасцю за ўжыванне катаванняў: забеспячэнне адказнасці для вінаватых і правасуддзя для ахвяр*, у панэлях ”Асаблівыя выклікі для дасягнення адказнасці за акты катаванняў і іншага жорсткага абыходжання ва ўзброеных канфліктах і шляхі іх пераадолення” і ”Як адолець перашкоды для дасягнення адказнасці за акты катаванняў і іншага жорсткага абыходжання” (13 чэрвеня 2022 года).
- Выступ на паралельным мерапрыемстве Варшаўскай канферэнцыі АБСЕ па чалавечым вымярэнні *”Унутраныя рэпрэсіі і транснацыянальная агрэсія: забеспячэнне адказнасці ў Беларусі”* (28 верасня 2022).

## F. Інфраструктура Платформы

### a. Фінансаванне

Да чэрвеня 2022 года Платформу падтрымлівала шырокае кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Злучаныя Штаты, Ірландыя, Ісландыя, Канада, Латвія, Літва, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Нідэрланды, Польшча, Румынія, Славакія, Фінляндыя, Чэшская рэспубліка, Швейцарыя, Эстонія, а таксама Еўрапейскі Саюз.

Для Фазы II, якая пачалася ў ліпені 2022 года і працягнецца па верасень 2023 года, Платформу падтрымліваюць Аўстрыя, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Злучаныя Штаты, Ісландыя, Літва, Нарвегія, Нідэрланды, Славакія, Швейцарыя, Швецыя, Фінляндыя, Чэшская рэспубліка, а таксама Еўрапейскі Саюз, якія на дадзены момант пацвердзілі фінансаванне. Шэсць іншых дзяржаў паведамілі, што пацвердзяць дадатковае фінансаванне ў канцы 2022 або 2023 года.

Як ужо паведамлялася, на працягу ўсяго справаздачнага перыяду Платформа атрымлівала фінансаванне ад дзяржаў-донараў на рэгулярнай аснове. Улічваючы, што толькі дзевяць дзяржаў ўнеслі сродкі праз Еўрапейскі фонд у падтрымку дэмакратыі( EED), прыйшлося прыкласці нямала намаганняў для выканання патрабаванняў кожнай дзяржавы па выдзяленні фінансавання.

### b. Стандартныя аперацыйныя працэдуры

Платформа працягвае ўдасканальваць свае стандартныя аперацыйныя працэдуры, якія карэктуюцца ў адпаведнасці з працэдурамі, што дадаюцца па ходзе працы. Як ужо адзначалася, САПы працягваюць служыць асновай для распрацоўкі кіроўных дакументаў, неабходных для працы Платформы.

### c. Інфармацыйныя тэхналогіі і бяспека

У інфраструктуру IT і бяспекі былі ўнесены нязначныя карэктывы, у тым ліку даданне абароненай кантактнай формы на сайце Платформы (гл.раздзел E. a).

### d. Кансультацыі з экспертамі

Платформа па-ранейшаму атрымлівала кансультацыі і рэкамендацыі экспертных арганізацый, такіх як IICI (Міжнародны інстытут крымінальных расследаванняў), PJI і Mnemonic, а таксама FORCYD.

## G. Далейшае планаванне – Фаза II і будучыня

У месяцы, якія папярэднічалі завяршэнню першай фазы, Платформа правяла кансультацыі з дзяржавамі-донарамі адносна неабходнасці працягу працы на другім этапе дзейнасці (Фаза II). Акрамя чатырнаццаці дзяржаваў, якія пацвердзілі свае намеры ў дачыненні да другой фазы, яшчэ шэсць дзяржаваў паведамілі, што будуць імкнуцца даць фінансаванне ў 2023 годзе. Што тычыцца Фазы I, то спатрэбілася вельмі шмат працы, звязанай з выкананнем вельмі розных патрабаванняў розных донараў, а затрымка паступлення фінансавання ад дзяржаў ставіць пад пагрозу здольнасць Платформы завяршыць усю запланаваную дзейнасць.

Гатоўнасць донараў да фінансавання другой фазы адлюстроўвае рэаліі таго, што праца па забеспячэнні адказнасці – справа доўгатэрміновая. Працэс аналізу вялікіх аб’ёмаў інфармацыі і падрыхтоўкі матэрыялаў для падтрымкі органаў пракуратуры патрабуе часу, а складанасць крымінальнага расследавання і судовага пераследу буйнамаштабных міжнародных злачынстваў – падыходу, які выходзіць за рамкі кароткіх цыклаў праектнага фінансавання, па якіх звычайна працуюць донары. Органы пракуратуры могуць прыняць рашэнне аб узбуджэнні расследавання толькі праз гады пасля здзяйснення злачынстваў або тады, калі меркаваны злачынец апынецца пад іх юрысдыкцыяй. У такія моманты для эфектыўнага судовага пераследу вельмі важны свабодны доступ да інфармацыі і доказаў, што робіць дадзеныя, сабраныя Платформай, і доступ да іх у будучыні вельмі карыснымі для органаў крымінальнага правасуддзя. Для дасягнення гэтых мэтаў на працягу наступных 12 месяцаў Платформа, сярод іншага, правядзе наступныя дзеянні:

- Працягне збор, кансалідацыю, аналіз і захаванне інфармацыі і доказаў злачынстваў па міжнародным праве;
- Працягне падтрымліваць і ўмацоўваць стусункі з нацыянальнымі органамі крымінальнага правасуддзя, якія праводзяць эфектыўныя, незалежныя і бесстароннія расследаванні ў рамках універсальнай юрысдыкцыі ці іншых формаў юрысдыкцыі;
- Будзе падтрымліваць групу УВКПЧ па разглядзе сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі на працягу ўсяго другога тэрміну яе паўнамоцтваў, а магчыма і трэцяга, калі яе мандат будзе падоўжаны, і імкнуцца падтрымліваць іншыя органы і механізмы ААН па правах чалавека, па меры магчымасці; і
- Будзе падтрымліваць працу членаў Кіруючага камітэта і Кансультатыўнага савета Платформы, звязаную з прыцягненнем да адказнасці.

Донарская падтрымка таксама адлюстроўвае прызнанне каштоўнасці Платформы як мадэлі ў іншых кантэкстах, а таксама верагоднасць далейшага прымянення значнай часткі работы па стварэнні такой інфраструктуры ў іншых краінах. Адпаведна, акрамя забеспячэння доўгатэрміновасці вынікаў працы Платформы, адной з яе задач на другім этапе з'яўляецца вывучэнне магчымасці прымянення распрацаванай ёю інфраструктуры і інструментаў у іншых кантэкстах і ў Беларусі пасля завяршэння другой фазы Платформы. Стандартныя аперацыйныя працэдуры, кіраўніцтвы і лічбавая інфраструктура з мінімальнымі карэкціроўкамі могуць быць перанесены ў іншыя кантэксты, а падрыхтаваная каманда зможа ўкараняць іх у партнёрстве з мясцовымі экспертамі, і падтрымліваць працу па зборы, верыфікацыі, аналізу і захаванню інфармацыі і доказаў злачынстваў, здзейсненых у іншых краінах, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі перадавой практыкі. Больш за тое, Платформа ўжо падзялілася сваім досведам і інструментамі з іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і праектамі па прыцягненні да адказнасці, якія працуюць у кантэксце Украіны і атрымліваюць падтрымку Міністэрства замежных спраў Даніі.

## Зноскі

1. «Мы выйшлі за мір, а апынуліся ў турме»: антываенныя акцыі грамадзян і рэакцыя беларускага рэжыму, сёмая прамежкавая Справаздача Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі, падрыхтаваная ў супрацоўніцтве з маніторынгавай групай «Беларускі Гаюн»: https://drive.google.com/file/d/1tDEr-mclhVOXnlF8aPBMpqTvGt-PJvfM/view
2. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: верасень 2022 г.: https://spring96.org/en/news/108381.
3. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: студзень 2022 г.: https://spring96.org/en/news/106649.
4. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: верасень 2022 г.: https://spring96.org/en/news/109379.
5. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: чэрвень 2022 г.: https://spring96.org/en/news/108381.
6. Вясна, кантрабанда і фінансаванне пратэстаў: заключнае абвінавачванне праваабаронцаў з Вясны, 26 верасня 2022 г.: https://spring96.org/en/news/109180.
7. Вясна, «Гэтая ўзнагарода -- вялікая падтрымка для нас у нашай місіі», Вясна атрымала ўзнагароду the Albie Award 2022: https://spring96.org/en/news/109246.
8. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: Красавік 2022 г.:https://spring96.org/en/news/107697.
9. Гл. Улады злоўжываюць крымінальным правам, судзячы нязгодных за «тэрарызм»: Заява праваабарончай супольнасці Беларусі, 18 кастрычніка 2022 г.: https://spring96.org/en/news/109477.
10. У Следчым камітэце падвялі вынікі працы за першае паўгоддзе 11 жніўня 2022 года: https://sk.gov.by/ru/news-ru/view/v-sledstvennom-komitete-podveli-itogi-raboty-za-pervoe-polugodie-11675/ /
11. Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі: жнівень 2022 г.: https://spring96.org/en/news/109095.
12. Гл. Defenders: https://www.defenders.by/right_to_protection. Прыклады такіх выпадкаў гл. у публікацыі Defenders, "Пераслед адвакатаў пасля выбараў", 13 чэрвеня 2022 г.: https://www.defenders.by/persecutionoflawyers_2020.
13. Defenders, Працягваецца адток юрыстаў з беларускай адвакатуры, 21 ліпеня 2022 г.: https://www.defenders.by/lawyers_exodus; Defenders: https://www.defenders.by/right_to_protection; Defenders, Што адбываецца ў беларускай адвакатуры пасля «рэформы», 7 чэрвеня 2022 г.: https://www.defenders.by/what-is-going-on-bar.
14. Lawtrend, Маніторынг сітуацыі са свабодай аб'яднанняў і арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь: верасень 2022 г.: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/monitoring-the-situation-of-freedom-of-association-and-civil-society-organisations-in-the-republic-of-belarus-september-2022.
15. Закон Рэспублікі Беларусь Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 27.10.2022 г. № 217-З "Аб дэнансацыі Рэспублікай Беларусь Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах» -- Pravo.by.
16. У другой квартальнай справаздачы за 2022 год Платформа паведаміла, што яна захоўвае каля 15 000 файлаў, якія датычацца 1722 сведак. У той час як колькасць сведак павялічылася, колькасць файлаў скарацілася з-за выдалення аўдыё - і відэафайлаў пасля таго, як Платформа змяніла сістэму, якая ўжываецца для перакладу інтэрв›ю з пацярпелымі і сведкамі.
17. Гл. Другая справаздача аб ходзе работы Платформы (09/21-01/22), 22 лютага 2022 года, публічная версія: https://iapbelarus.org/wp-content/uploads/2022/04/IAPB_SecondReport_Public_FINAL_2022.pdf.
18. Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх: даклад Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, UN Doc. A / HRC / 49 / 71, 4 сакавіка 2022 г., абзац 10: https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/G22/276/97/PDF/G2227697.pdf?OpenElement.
19. Савет правоў чалавека ААН, рэзалюцыя 49/26: Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх, UN Doc. A/HRC/RES/49/26 (7 красавіка 2022 г.).
20. Напрыклад, Deutsche Welle, Катаванні ў Беларусі: як будуць прыцягнутыя да адказнасці сілавыя структуры / Беларусь: погляд з Еўропы, 1 мая 2021 г.: https://www.dw.com/ru/pytki-v-belarusi-kak-silovikov-privlekut-k-otvetstvennosti/a-57381817
21. Гл. https://iapbelarus.org/press-statements/.